

Нефармат

# РЭХА СУСЕДСКАЙ РАЗБОРКІ

Не так даўно ў Брэсцкім раёне адбылося здарэнне, якое трапіла ў міліцэйскія зводкі. Пра выпадак тады паведамлялі, здаецца, усе мясцовыя СМІ, інфармацыя падавалася найбольш як суседская разборкі. І сапраўды, падставай для здарэння, а дакладней, пажару стала непаразуменне паміж суседзямі. А вось прычынай...

Добра, калі суседзі добрыя, асабліва ў вёсцы. Тады можна і словам перамовіцца, і дапамагчы адно аднаму ў якой справе, і ў свята разам пасядзець. А вось калі адносіны не складваюцца, тады горш, тады ўзводзяцца вялікія агароджы, пішуцца скаргі, канфлікты нярэдка разглядаюць органы ўлады альбо чыноўнікі розных узроўняў. Не раз даводзілася бываць на прыёмах і слухаць скаргі аднаго суседа на другога.

Гэтыя вяскоўцы ўладныя парогі не абівалі, адзін на другога не скардзіліся, што, можа, і лепей было б у дадзенай сітуацыі. Яны, як выглядае, мірна суіснавалі да пэўнага часу. Пра аднаго з фігурантаў, яго занятак, лад жыцця і звычкі, як той казаў, гісторыя змоўчвае. Ёсць толькі скупая інфармацыя ў крымінальнай справе, што ў момант здзяйснення хуліганства быў нападпітку. Пра яго крыху пазней. А вось другога — гаспадара — нехта ў вёсцы жартам назваў памешчыкам, але часцей — фермерам.

Справа, як быццам, пачэсная: развесці вялікую гаспадарку, гадаваць свіней, як у нашым выпадку, і карміць сям'ю сумленна зарробленым рублём. Але ж тыя старадаўнія памешчыкі, якіх згадвалі аднавяскоўцы ўдзельнікаў здарэння, хлявы ўзводзілі асобна ад маёнткаў ды разводзілі там усялякую жыўнасць. Наш герой сваю ферму трымаў на падворку. У матэрыялах крымінальнай справы потым будзе фігураваць 50 галоў свіней, якія загінулі, а колькі іх было ўсяго: шэсцьдзясят, семдзесят ці болей — невядома. Уяўляеце, які пах стаіць у наваколлі, дзе кожны дзень спраўляе фізіялагічныя патрэбы такая колькасць жывёлы? А яшчэ ў гэтага незарэгістраванага «фермера» было пад сотню курэй ды іншае птаства. Уявілі? Расказваю далей.

Цалкам зразумела, што найбліжэйшаму суседу не падабалася атмасфера, дакладней, той факт, што гэтую атмасферу штодня атручвалі смуродам прымітыўнай свінафермы. Як вядома, на прамысловых свінакомплексах працэс ачысткі наладжаны, там стойлы чысціць і мые аўтаматыка штораніцы. Ну а наш герой, відаць, таксама збіраў і вывозіў гной, у такі час, трэба думаць, пах яшчэ больш узмацняўся.

...Дык вось аднойчы неабцяжараны гаспадаркай сусед, крыху выпіўшы, тым самым прытупіўшы крытычнае мысленне, узяў петарду, падпаліў яе і кінуў праз суседаў плот. Як ён потым будзе тлумачыць, хацеў напужаць. Надвор'е стаяла сухое, і тая петарда, як на зло, трапіла ў нейкую кучку саломы, апошняя ўспыхнула, агонь раптам перакінуўся на гаспадарчыя пабудовы. Пажарных выклікала другая суседка, якая заўважыла дым. Прыехалі хутка. Жыллё і людзі не пацярпелі. Аднак агонь паспеў пашкодзіць тры гаспадарчыя пабудовы: сховішча для агародніны, будынак для кармавых сумесяў, яшчэ адзін хляўчук. І, самае галоўнае, загінула пяцьдзясят свіней і амаль столькі ж курэй.

Вінаватага затрымалі, можна сказаць, па гарачых слядах. Яму прад'явілі знішчэнне і пашкоджанне чужой маёмасці па неасцярожнасці, якое пацягнула за сабой прычыненне ўрону ў асабліва буйных памерах. Суд разгледзеў справу і прызначыў грамадзяніну пакаранне ў выглядзе абмежавання волі тэрмінам на два гады з накіраваннем ў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу, якую ў народзе называюць «хімія». Акрамя таго, вінаваты павінен кампенсаваць урон у суме 67 000 рублёў, а таксама выплаціць 30 000 рублёў маральнага ўрону.

Як напісаў адзін дасціпны калега, глупства не трэба рабіць нават ад суму, асабліва глынуўшы спіртнога. Усё так. Вінаваты панёс заслужанае пакаранне. Пра пацярпелага больш інфармацыі няма. Хутчэй за ўсё ён адрамантуе свае хлявы, адновіць пагалоўе і зноў будзе вырошчваць свіней пасярод вёскі. А іншыя, хай і не самыя блізкія суседзі, вымушаны будуць удыхаць смурод і зачыняць вокны нават у летнюю спёку. Бо пры высокіх тэмпературах асабліва хутка паднімаюцца пары свінафермы і адчуваецца едкі пах.

На жаль, падобныя сітуацыі з аматарамі падсобнай гаспадаркі далёка не адзінкавыя ў нашых вёсках. Уласная гаспадарка — гэта вельмі добра... для яе гаспадара. Тады чаму ад яе мусяць цярпець навакольныя? А вось гэта ўжо, па-мойму, павінна рэгулявацца законам. Калі хочаш гадаваць свіней, бяры кавалак зямлі, будуй памяшканне за межамі населенага пункта, каб нікому не перашкаджаць. А на прысядзібным участку варта дазволіць трымаць адну-дзве, няхай, тры свінкі, як бывала раней у вёсках. Так жа і з буйной рагатай жывёлай. Павінна быць абмежаванне ў колькасці галоў, ды і птаства не выпадае сотнямі гадаваць на падворку пасярод вуліцы. Ніхто ж не хоча дзень пры дні душыцца чужым смуродам. А што рабіць, калі цябе прымушаюць? Шукаць абароны ў законах, а калі іх няма ці яны недасканалыя, трэба іх карэкціраваць. Рабіць апошняе ёсць каму: зусім нядаўна мы выбралі новых дэпутатаў усіх узроўняў.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 5.47 | 20.29 | 14.42 |
| Віцебск — | 5.33 | 20.23 | 14.50 |
| Магілёў — | 5.37 | 20.19 | 14.42 |
| Гомель — | 5.38 | 20.11 | 14.33 |
| Гродна — | 6.03 | 20.43 | 14.40 |
| Брэст — | 6.08 | 20.40 | 14.32 |

### Месяц

*Поўня ў 2.48.*
*Месяц у сузор'і Скарпіёна.*

### Імяніны

***Пр.*** *Анціпа, Івана, Прохара, Пятра, Рыгора, Якава.*
***К.*** *Валерыі, Аляксандра, Аляксея, Рыгора.*



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

## ЗАЎТРА




## 24 КРАСАВІКА

Даты | Падзеі | Людзі

***Міжнародны дзень салідарнасці моладзі. Адзначаецца па рашэнні Сусветнай федэрацыі дэмакратычнай моладзі ў дзень, калі на заключным пасяджэнні Бандунгскай канферэнцыі краін Азіі і Афрыкі было прынята рашэнне аб'явіць 24 красавіка Міжнародным днём салідарнасці моладзі ў барацьбе супраць каланіялізму і за мірнае суіснаванне.***

У краіне

**1899** год — нарадзіўся (г. Кобрын) Аскар Зарыскі, амерыканскі матэматык, адзін з заснавальнікаў алгебраічнай геаметрыі, член Нацыянальнай акадэміі навук ЗША (1944).

**1944** год — нарадзіўся (в. В. Заўшыцы Салігорскага раёна) Іван Пятровіч Яновіч, беларускі канструктар у галіне медыцынскай тэхнікі. Распрацоўшчык спецыяльнага тэхналагічнага абсталявання для вытворчасці паўправадніковых прыбораў і інтэгральных схем, новых метадаў тэрмаапрацоўкі металаў і іх сплаваў, штучных клапанаў сэрца і іншых арыгінальных мікравырабаў для кардыяхірургіі. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі.



**1944** год — у выніку падзелу Заходняга фронту на 2-і і 3-і Беларускія франты ўтвораны 3-і Беларускі фронт, які дзейнічаў да 15 жніўня1945 года. Войскі фронту, удзельнічаючы ў Беларускай аперацыі (1944), сумесна з іншымі франтамі правялі Віцебска-Аршанскую аперацыю, Мінскую аперацыю, сваімі сіламі Віленскую аперацыю. На заключным этапе вайны адыгралі вырашальную ролю ў правядзенні Усходне-Прускай аперацыі. Камандуючыя: генерал арміі І. Д. Чарняхоўскі, Маршал Савецкага Саюза А. М. Васілеўскі, генерал арміі І. Х. Баграмян.

У свеце

**1184** год да н. э. — згодна з паданнем, у гэты дзень старажытныя грэкі змаглі трапіць у Трою пры дапамозе траянскага каня.

**1792** год — у Вашынгтоне распачалося будаўніцтва Белага дома, рэзідэнцыі амерыканскіх прэзідэнтаў. Белы дом быў афіцыйнай рэзідэнцыяй усіх прэзідэнтаў ЗША, за выключэннем Джорджа Вашынгтана, які займаў гэты пост з 1789 да 1797 года.



**1884** год — Грынвіч быў зацверджаны месцам праходжання нулявога мерыдыяна.

**1981** год — адбылася прэзентацыя першага персанальнага камп'ютара IBM.

Так гаварыў...

**АЛЯКСАНДР СУВОРАЎ:**

*«Вазьмі сабе за прыклад героя, глядзі на яго, ідзі за ім услед, дагані; абгоніш — слава табе».*

## УСМІХНЕМСЯ

**Гэты непрыемны момант, калі ты мыеш посуд і нехта ззаду падкладвае яшчэ стос посуду ў ракавіну... Асабліва калі ты жывеш адзін...**

— Гэта тэлефануюць з майстэрні па рамонце аўтамабіляў. Ваша жонка заехала, каб адрамантаваць машыну, але мы не ведаем, хто будзе...

— Усё зразумела, за рамонт плачу я.

— Ды я не пра гэта турбуюся. Я хачу даведацца, хто заплаціць за рамонт майстэрні?

**Прыходзіць трэці сын на балота за сваёй стралой. І кажа яму жаба чалавечым голасам:**

**— Добры дзень, Ваня!**

**— Я не Ваня, я Франсуа.**



ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, праспр. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 11.766. Індэкс 63850. Зак. № 901.

Нумар падпісаны ў 19.30 23 красавіка 2024 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12